**Лукс С.А.,** студэнт 114 т гр.
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.

# МІФА ПАЭТЫЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ БЕЛАРУСАЎ ПРА ПТУШЫНЫ СВЕТ

Вобразы птушак займаюць значнае месца ў традыцыйнай культуры беларусаў. Ім надаецца сакральны сэнс, здольнасць узаемадзейнічаць з людзьмі, дапамагаць у крызісных сітуацыях. Напрыклад, паводле народных павер‘яў, птушкі аберагаюць хаты, перадаюць весткі ад продкаў, прыносяць дзяцей і інш. «У беларусаў выступаюць як міфапаэтычныя класіфікатары божай існасці, верху, неба, сонца, грому, жыцця, урадлівасці, багацця, сувязі паміж касмічнымі зонамі, душы, духа жыцця» [1, с. 378]. На наш погляд, каб акрэсліць у агульных рысах міфапаэтыку птушак у беларускай народнай традыцыі, трэба разгледзець вясновыя абрады, арнамент, тэксы жартоўных песень, казкі пра жывёл, танцы. Немалаважную ролю можа адыграць аналіз прозвішчаў (Шпак, Салавей, Зязюля, Варона, Крук і інш.).

У вясновых абрадах птушкам надаецца сакральны сэнс. Напрыклад, на Дабравешчанне (7.04) асабліва ўшаноўваецца бусел. Падчас гэтага абраду людзі пякуць абрадавае печыва (галёпы) у выглядзе бусла, сочаць, каб бусел звіў гняздо на страсе. Існуюць розныя прыкметы на будучы год, звязаныя з гэтай птушкай. У беларускай міфалогіі бусел – татэмная птушка, у пацверджанне чаго можна прыгадаць, што яе ўспрымаюць як святога памочніка, сімвал супружаскай вернасці [3, с. 56]. Таксама вобразы птушак сустракаюцца ў вераваннях, звязаных са святам «Саракі» (22.03). Паводле народных уяўленняў, у гэты дзень з 40 выраяў прылятаюць 40 птушак. Таксама да гэтага дня пякліся традыцыйныя галёпы, людзі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыносілі птушкам галінкі для гнёзд. Лічылася, што птушкі маюць кантакт са светам продкаў, і на сваіх крылах прыносяць вестачкі ад іх у свет людзей.

Нярэдка матывы птушак сустракаюцца ў арнаменце. Арнамент – вельмі важная з‘ява традыдыйнай культуры. У кожным малюнку на ручніках, вопратцы выражаны пэўны сэнс. Сярод арнаментальных абстрактных выяў птушак вылучаюцца галубы і певень. З галубамі развіваюцца матывы: каханне, каханне ў росквіце, каханне без узаемнасці, разлука. Арнамент з галубамі невыпадкова носіць сэнс кахання: у народнай культуры, голуб – сімвал кахання і вернасці. Адзначым, што косткі голуба выкарыстоўвалі у любоўнай магіі. Голуб мае значны сэнс у хрысціянстве як птушка, што ўвасабляе святы дух.

Певень – свойская птушка, сімвал Сонца, жыццёвай сілы, урадлівасці, захавальнік хатняга агменю і дабрабыту. Таму Певень уяўляецца вестуном святла, звязваецца з боствамі сонца і агню. Як заўважае У.М. Тапароў, Певень не проста падобны да сонца, «ён сам-зямны вобраз, трансфармацыя нябеснага агню, Сонца, таму певень сімволіка ўваскрэсення з мёртвых, сімволіка вечнага аднаўлення жыцця» [3, с. 355]. Таму Певень часта сустракаецца у арнаментах [1, с. 80, 91].

Казкі – адзін з самых старажытных жанраў беларускага фальклору. Вытокі іх адносяцца да таго часу, калі першабытны чалавек яшчэ не вылучаў сябе з навакольна свету. Казкі пра жывёл паступова станавіліся скарбніцай, у якой увасабляліся веды паляўнічых пра паходжанне, асаблівасці паводзін і знешняга выгляду птушак і жывёл. У аснове ўзаемадносін паміж чалавекам і жывымі істотамі была міфалогія. Шматлікія прадстаўнікі жывёльнага свету былі ўзведзены ў ранг родавага боства – татэма, а «старажытныя светапоглядныя ўяўленні, у аснове якіх ляжалі антрапаморфныя, анімістычныя і татэмістычныя вераванні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

непасрэдна паўплывалі на фарміраванне сюжэтных цыклаў у казках пра жывёл» [3, с. 608]. У казачным эпасе вялікую ролю адыгрываюць птушкі. Назавем толькі некаторыя з казак: «Курачка-Раба», «Верабейка», «Варона і лісіца», «Ліса і журавель», «Коцік, пеўнік і дрозд», «Лісіца і дрозд», «Ліса і бусел» і інш.

Жартоўныя песні – важная частка беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці. «Яны з‘яўляюцца духоўным скарбам нацыянальнай культуры беларусаў, помнікам мастацтва народнага слова, узорам паэтычнай дасканальнасці глыбіня зместу і паўнапраўнасць паэтычных вобразаў гэтых песень заўсёды выдатных мастароў мастацтва» [2, с. 5]. Сярод вялікага кола жартоўных песень, існуе значная группа прысвечаная птушкам, напрыклад: «Як учыніў верабей», «Чачотачка», «Шчыгель вылятае», «Сава мая, савінка», «Перапёлачка» і інш. У іх мы назіраем цэлы «птушыны народ», які жыве, працуе, весяліцца, гуляе вяселлі падобна людзям. Узгадаем радкі песні «За морам сінічка не бедна жыла»: Малады сінічанька, чаму ты не жэнішся? <…> Рад бы жаніцца, ды некага ўзяці, // Узяў бы сароку – белабокая, // Узяў бы варону – даўганосая, // Узяў бы чачотку – ды цётка мая, // Узяў бы сянічку – ды сястрычка мая» [2, с. 505].

Танцы – найстаражытнае з мастацтваў: яно адлюстроўвае ўзыходзячую да самых ранніх часах патрэбу чалавека ўступаць у камунікацыю праз рухі свайго цела. Танец быў у аснове рытуалу: усе знакавыя падзеі ў жыцці першабытнага чалавека адзначаліся танцамі. Першапачаткова гэта былі магічныя рытуальныя дзеянні. Танцы прысвячаліся розным культам, у тым ліку птушкам-татэмам, напрыклад, «Журавель», «Зязюля», «Пеўнік», «Перапёлачка» і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, можна сцвярджаць, што птушкі у традыцыйнай культуры беларусаў, адыгрываюць вельмі значную ролю, з‘яўляюцца носьбітамі магічных сэнсаў і праекцыяй свету людзей.

---

1. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1996. – 208 с.

2. Жартоўныя песні / рэд. А.С. Фядосік, Г.І. Цітовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 728 с.

3. Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік / склад. І. Клімовіч, В. Аўтушка; навук.рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Луценко А.А.,** студентка 431 гр.
Научный руководитель — Козленко Е.Ю.

## МУЛЬТИМЕДИЙНЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В ПРОЦЕССАХ ПОДГОТОВКИ БИБЛИОГРАФИЧЕСКОЙ ПРОДУКЦИИ ПУБЛИЧНЫМИ БИБЛИОТЕКАМИ

Специфика библиографической работы многопланова и включает в себя различные процессы и операции: выявление и группировку документов разных отраслей знания, работу с большими массивами информации, качественный отбор документов, удовлетворение сложных или неопределенных читательских запросов, составление библиографических пособий, консультирование и информационное обучение читателей и др. Каждый из этих видов работы направлен на выполнение одной из главных функций библиотеки – информационной.